*Бондар Ганна Аляксандраўна,*

*студэнтка 4-га курса факультэта пачатковай і музычнай адукацыі*

*УА “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова”*

**ТЭМА** Барыс Сачанка. «Хлеб» (урок літаратурнага чытання ў ІІІ класе школ з рускай мовай навучання).

**МЭТА**: Узбагачаць слоўнікавы запас вучняў лексікай апавядання. Працягнуць фарміраваць уяўленні вучняў аб жыцці і характары дзяцей у пасляваенны час сродкамі мастацкага слова. Развіваць у вучняў творчае ўменне прыдумваць заканчэнне апісаных у творы падзей, лагічнае мысленне, увагу і маўленне. Развіваць уменні тлумачыць учынкі дзейных асоб, выказваць свае адносіны да іх зместу прачытанага. Назіраць за формай апавядання: хто распавядае: герой ці аўтар? Вучыць вызначаць тэму і галоўную думку апавядання. Развіваць уменне выразна, правільна і асэнсавана чытаць твор уголас з захаваннем інтанацыі сказа, паўз і патрэбнага тону.

**ТЫП УРОКА**: вывучэння новага матэрыялу.

**МЕТАДЫ**: слова настаўніка, гутарка, работа з падручнікам.

**ФОРМЫ РАБОТЫ:** франтальная.

**АБСТАЛЯВАННЕ**: вучэны дапаможнік “Літаратурнае чытанне, 3 клас, ч. 2” (аўтар М.В.Жуковіч), фотаздымак Б.Сачанкі, фотаздымкі хлеба ў час вайны, папяровы мабільны тэлефон (па колькасці вучняў).

## ХОД УРОКА

### I. АРГАНІЗАЦЫЙНЫ МОМАНТ.

**Настаўнік**. Добры дзень, дзеці! Сядайце.. Памахайце рукой, калі вы жадаеце хутчэй пачаць урок. Усміхніцеся адзін аднаму тыя, хто ўпэўнены, што будзе ўважлівы і старанны. І так пачынвем наш урок.

### II. ПРАВЕРКА ДАМАШНЯГА ЗАДАННЯ.

**Настаўнік.** Дзеці давайце зараз праверам дамашнее заданне. Дома вам трэба было падрыхтавацца да падрабязнага пераказу ўрыўка пра подзвіг ката Марціна”.

На дошцы запісаны апорныя сказы з тэксту па якім мы і будзем пераказваць твор.

-  “У той дзень стаяла цішыня…”
-  “Бачу- за некалькі крокаў ад мяне сядзіць худы чорны кот …”
-  “Захацеў паглядзець адкуль міны ляцяць” і ў маей галаве зашавялілася цікавая задумка…”
-  “Наступага дня мы чакалі з нецярпеннем…”
- -  “А ты – Віця?- звярнуўся да хлопчыка камандзір роты…”

### III. АРТЫКУЛЯЦЫЙНАЯ РАЗМІНКА.

**Настаўнік:** Дзеці, зараз мы з вамі правядзем размінку для вуснаў- назывецца "Усмешка" . Вам патрэбна шырока ўсміхнуцца, зубы сціснуць.

**Настаўнік**: Усміхаецца шчанюк,
Зубкі напаказ.
Я б дакладна так жа змог,
Вось, глядзі. Зараз.

**Настаўнік**: Зробім з вамі яшчэ аду размінку назывецца «Слонік». Удыхнуць, выцягнуць вусны і на выдыху прамаўляць «у-у-у-у ...». Трымаць да 5 секунд. Паўтарым 3 разы.

## IV. ВЫВУЧЭННЕ НОВАГА МАТЭРЫЯЛУ.

### 4.1. Паведамленне тэмы/ мэты ўрока.

**Настаўнік.** Сёння на ўроку ў нас вельмі паважаны госць. Я думаю, вы ўжо здагадаліся, хто гэта (на дошцы вывешваюцца малюнкі хлеба (дадатакі).

І сёння мы пазнаёмімся з выдатным творам Барыса Сачанкі “Хлеб” і даведаемся пра цяжкае пасляваеннае жыцце.

### 4.2. Вывучэнне твора Барыча Сачанка “Хлеб”

### 4.2.1 Падрыхтоўка да ўспрымання твора. Слоўнікавая работа. Знаемства з аўтарам.

**Настаўнік:**

Гісторыя хлеба пачынаецца яшчэ 17 тысячагоддзяў таму, калі рабілі яго не з злакавых, а з жалудоў. З тых часоў тэхналогія вытворчасці хлеба бесперапынна ўдасканальвалася-спачатку людзі адкрылі для сябе зёлкавыя, мука якіх выдатна падыходзіла для вырабу хлеба, затым да пакуты сталі дадаваць абрызглы малако, потым былі вынайдзены дрожджы і першыя спецыяльныя печы. Самы старажытны хлебны каравай знаходзіцца ў Брытанскім музеі ў Лондане. Ён выраблены з пшанічнай мукі чатыры тысячы гадоў таму. У кожнай краіне свету ёсць свае рэцэпты хлеба, але першасна хлеб - гэта выпякаецца прадукт з вады і мукі.

Хлеб - гэта прадукт харчавання, які можна ўжываць амаль з усімі іблюдамі. Але у час вайны і пасля яе заканчэння хлеб быў бескаштоўным скарбам. У гады вайны людзям не даводзілася выбіраць хлеб па гатунках, елі тое, што было, і па складзе хлеб далёка адрозніваўся ад звыклага нам.

Беларусы заўсёды ставіліся да хлеба з вялікай павагай і пашанай і казалі так: “Хлеб у хаце - гаспадар, у працы - сябар, а ў дарозе - таварыш”.

**Слоўнікавая работа**

Вучні з дапамогай настаўніка тлумачаць значэнне слоў. Не знаемыя словы запісаны на дошцы. Вучні знаходзяць у тэксце сказы з вывучанымі словамі і зачытваюць іх.

**Борзда** – хутка;
**Грэх** – заганны, ганебны ўчынак; учынак, які выклікае асуджэнне;
**Неахайна** – неакуратна;
**Капаніца** – прылада для працы на агародзе;
**Абрус** – кавалак тканіны, якой засцілаюць стол;
**Спакуса** – тое, што выклікае неадольнае жаданне;
**Мроіўся** – бачыўся, уяўляўся ў думках, сніўся;
**Схамянуцца** – раптам успомніць аб чым-небудзь.

**Пракаўтнуў** - праглынуў
**Знаемства з аўтарам.**
**Настаўнік: (**На дошцы вісіць фотаздымак Б.Сачанкі).
Барыс Сачанка адзін з самых вядомых пісьменнікаў Беларусі. Нарадзіўся 15 траўня 1936 года. ў вёсцы Вялікі Бор на Гомельшчыне, пражыў  толькі 59 гадоў. Ён быў трэцім дзіцём у вялікай сям'і (усяго сямёра дзяцей) Сачанкаў. Бацька – Іван Мікалаевіч працаваў у лясной гаспадарцы, а маці – Вера Міхайлаўна – займалася сям'ёй.

Творы Барыса Сачанкі перакладзены на англійскую, балгарскую, нямецкую, польскую, рускую, украінскую, французскую і іншыя мовы.
Жыццё гэтага чалавека абарвалася раптоўна. 5 ліпеня 1995 года Барыс Іванавіч памёр у сваім рабочым кабінеце Барыс Сачанка памёр як ваяр, абараняючы родную мову, робячы ўсё магчымае дзеля яе захавання і распаўсюджвання. Пахаваны на Усходніх (Маскоўскіх) могілках у Мінску.
Вучоба і дзейнась Б.Сачанкі (адзін з вучняу рыхтуе рэферат на 2-3 гадзіны).
**4.2.2 Знаемства з творам, праверка першаснага ўспрымання.**
**Настаўнік.** Дзеці, зараз я прачытаю вам твор Барыс Іванавіч Сачанкі "Хлеб" (чытанне з прыпынкам па часткам), вы ўважліва паслухайце, а потым адкажыце мне на наступныя пытанні:

1 частка
- У які час адбываюцца падзеі, апісаныя ў апавяданні?
- Як маці сябе паводзіла з хлебам?
- На колькі частак яна падзяліла хлеб?
- - Як павядзе сябе хлопчык далей?

2 частка
- Чаму хлопчык з'еў хлеб? Ці можна яго асудзіць?
- Як павёу сябе брат?
- Як адчуваў сябе хлопчык?
- Ці пакараюць хлопчыка за з'едзены хлеб?

3 частка
- Як аднесліся да гэтага ўчынку ў той вечар і пасля брат, маці?
- Чаму хлопчык вырас, але тое, што ён з'еў хлеб брата,  хвалюе яго ўсё жыццё?

Усе адкзы дзеці суправаджюць фрагментамі тэксту.
**Настаўнік:** Якія ўражанні склаліся ў вас пасля слухання апавяднне "Хлеб"?,  "Які настрой выклікаў у вас гэты твор? Чаму?
**ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА**
**Настаўнік** : Дзеці зараз з вамі правядзем фізкультхвілінку, паўтарайце калі ласка за мной:
раз, два, тры, чатыры, пяць –тупаем нагамі.
раз, два, тры, чатыры, пяць –пляскаем рукамі.
раз, два, тры, чатыры, пяць –будзем нахіляцца.

раз, два, тры, чатыры, пяць –сядзем зноў займацца.

***4.2.3 Чытанне твора  вучнямі .Ааналіз твора.***

**Настаўнік:** Рабята, зараз вы будзеце чытаць  твор ланцужком па абзацу.

**Настаўнік**. Дзеці ці заўважылі вы, як напісана апавяданне- ад 1-ці 3-й асобы?

**Дзеці:** Вядома, аповед пісьменнікам ад 1-й асобы абраны невыпадкова. Гэты прыем дае аўтару больш яскрава адлюстраваць пачуцці свайго героя. Бо хто ж лепш раскажа, калі не сам удзельнік падзей?

**Настаўнік**: Хто ,на вашу думку , з’яўляецца апавядальнікам- пісьменнік ці яго герой? Чаму аўтар напісаў твор ад 1-й асобы?

Чаму пісьменнік не даў галоўнаму герою імя? ( галодных дзяцей было шмат. Амаль кожны з іх мог расказаць такую гісторыю).

**Настаўнік**. Пры чытанні мы павінны перадаць пачуцці хлопчыка адпаведнай інтанацыяй. Зараз мы з вамі паспрабуем, адразу я чытаю сказ, а потым вы.

Настаўнік з вучнямі такім чынам чытаюць выбранны тэкст (*“Я вельмі хацеў есці. І той кавалачак хлеба, што дала мне маці, з’еў, праглынуў мігам…………..Хуценька – хуценька я палажыў скарыначку на стол, накрыў яе абрусам. Але спакуса з’есці хлеб увесь, каб яго і духу не было ў хаце, каб ім і не пахла нават...(с. 86-88)…Ніхто: ні маці, ні Толік- ні ў чым мяне не папракнулі.Ні ў той вечар, ні пасля.Яны былі старэйшыя, я – меншы (с 89).*

**Настаўнік**. Як вы лічыце, ці добра зрабіў хлопчык? (адказы вучняў). Чаму зроблены ўчынак  у дзяцінстве хвалюе хлопыка ўсе жыцце? Як вы лічыце, чаму дарослыя  не пакаралі малога за з’едзены чужы хлеб і ніколі не пакаралі яго? (адказы вучняў).

**V. Замацванне вывучанага матэрыялу . Развіцце маўлення.**

**Настаўнік** : Якая асноўная думка апавядання “Хлеб?”.

**Настаўнік:** Калі вы былі ўважлівы на ўроку, то лёгка разкладзеце па нумарам наступны тэкст ( вывешана на дошцы).

- Схамянуўся я тады, калі на маей далоні засталася абшчыпаная з усіх бакой скарыначка

2. Маці прынесла акрайчык хлеба

5. Ні ў чым мяне не папракнулі

3. Потым се ж не вытрымў

4. Было гэта даўно

11. Пайшла на агарод акопваць бульбу

6. Разламала акрайчык напапалам

7. Лепей бы я быў тады галодны

10. Узяў скарыначку ў рукі і ўкінуў яе ў рот

8. Брат вярнуўся з лесу

9. Не наеўся , толькі растравіў яшчэ больш

12. Раптам мне здалося, што маці мяне абдзяліла

**4,7,2,10,3,1,9,6,5,11,8,12**

## VI. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ УРОКА. РЭФЛЕКСІЯ

**Настаўнік:** Дзеці, з якім апавяданнем вы сення пазнаеміліся на ўроку? Што цікавага даведаліся? Давайце ўспомнім з якімі новымі словамі мы сення пазнаеміліся?

Скажыце калі ласка, якая тэма і галоўная думка апавядання «Хлеб» Б. Сачанкі? (Цяжкае і галоднае пасляваеннае жыцце падштурхнула хлопчыка да дэннага ўчынку, які ен памятае ўсе жыцце).

Як вы лічаце чаму твор мае такую назву? Якую назву прапанавалі б вы ? Чаму?

З якой мэтай Барыс Сачанка расказаў чытачам пра пасляваенны выпадак з жыцця?

**РЭФЛЕКСІЯ**

**Настаўнік**. Зараз я раздам вам папяровы мабільны тэлефон, а вы напішыце смс настаўніку ці сябру як прайшоў ваш урок:



1. Больш за ўсё на ўроку мне спадабалася…
2. Самым складаным было…
3. Сення на ўуроку я даведаўся аб …
4. Я жадаю ўсім……

## X. ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ.

Выразнае чытанне апавядання Б.Сачанка “Хлеб” і адказ на пытанні пасля яго.

Індывідуальнае заданне – падрыхтаваць па 3 пытанні для аднакласніка па зместу твора.


Барыс
Іванавіч
Сачанка
(1936 – 1995)
pinsklib.by





